БЕЛАРУСКАЯ ВЫЗВОЛЬНАЯ АРМІЯ

BIEŁARUSKAJA VYZVOLNAJA ARMIJA



# ЧАС ВЯРТАЦЬ БЕЛАРУСЬ!



Эмблема БВА



Герб паўстаньня 1863—1864 гадоў



Ротмістар БВА ў баявой форме

## ШТО ЎЯЎЛЯЕ САБОЙ БВА?

Беларуская вызвольная армія (БВА) — грамадзка-палітычная арганізацыя, якая мае вайсковы складнік. У склад БВА асобна або калектыўна ўваходзяць прадстаўнікі шырокага кола патрыятычных сілаў: удзельнікі вайсковых і парамілітарных фармаваньняў, грамадзкіх і палітычных арганізацыяў, якія падзяляюць агульныя мэты і стратэгію БВА.

## ЗА ШТО ЗМАГАЕЦЦА БВА?

Беларуская вызвольная армія змагаецца за аднаўленьне фактычна страчанага дзяржаўнага сувэрэнітэту Беларусі і перабудову яе ў свабодную дэмакратычную дзяржаву, якая падзяляе агульныя для беларусаў і эўрапейскай цывілізацыі каштоўнасьці. Асноўная мэта БВА — вызваленьне Беларусі ад гібрыднай акупацыі, зьвержэньне калябарацыянісцкага антынацыянальнага рэжыму і вяртаньне на радзіму мільёнаў беларусаў, гвалтоўна выгнаных рэпрэсіямі. БВА ставіць за стратэгічную мэту далучэньне Беларусі да Эўрапейскага Зьвязу як гарантыі трывалага ўстойлівага мірнага суіснаваньня народаў Эўропы, выступае за супрацоўніцтва з NATO, у тым ліку дзеля ўдзелу ў сумесных вучэньнях і місіях, фармаваньня войска па стандартах Альянсу дзеля забесьпячэньня нацыянальнай бясьпекі. Сярод зьнешнепалітычных прыярытэтаў БВА — пашырэньне супрацоўніцтва з краінамі Балта-Чарнаморскага рэгіёну (Інтэрмарыюма) і разьвіцьцё двухбаковых і шматбаковых адносінаў з мэтай умацаваньня міжнароднага становішча Беларусі.

## ЦІ МАЕ БВА ПАЛІТЫЧНЫЯ МЭТЫ?

БВА падтрымлівае кансалідацыю беларускіх дэмакратычных сілаў, прызнае ўнёсак палітычных цэнтраў у барацьбу зь незаконным рэжымам у Беларусі, але зьяўляецца самастойнай арганізацыяй. БВА імкнецца да фармаваньня адзінага беларускага нацыянальна–вызвольнага руху, які, безумоўна, мае палітычныя мэты, у тым ліку садзейнічаньне прыходу да ўлады дэмакратычных сілаў і ўдзел у фармаваньні органаў улады.

## НА ЯКІЯ ПРАЎНЫЯ НОРМЫ АБАПІРАЕЦЦА БВА?

БВА прызнае за праўную аснову сваёй дзейнасьці палажэньні першай рэдакцыі Канстытуцыі 1994 году (бязь зьменаў і дапаўненьняў), згодна зь якімі адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам сувэрэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь зьяўляецца народ. Супраціў незаконнай, злачыннай уладзе рэжыму для аднаўленьня канстытуцыйнага ладу, у тым ліку з выкарыстаньнем зброі як крайняга сродку, ёсьць канстытуцыйным абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і ў адпаведнасьці з Крымінальным кодэксам адносіцца да дзеяньняў у стане неабходнай абароны ці крайняй неабходнасьці, то бок разглядаецца як правамоцны. Таксама ў БВА маецца ўласная ўнутраная нарматыўная база: статут, афіцэрскі кодэкс, загады, распараджэньні і палажэньні па розных накірунках службовай дзейнасьці.

## ЯК СТАВІЦЦА БВА ДА ВАЙНЫ ВА УКРАІНЕ?

Беларуская вызвольная армія падтрымлівае гераічную барацьбу ўкраінскага народу супраць расейскай агрэсіі і спрыяе набліжэньню перамогі Ўкраіны. Службоўцы БВА непасрэдна ваююць за свабоду ў беларускіх нацыянальных фармаваньнях ва Ўкраіне, іншыя надаюць актыўную матэрыяльна-тэхнічную, фінансавую і інфармацыйную дапамогу беларускім добраахвотнікам.

## НА ЯКІХ ГІСТАРЫЧНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ ГРУНТУЕЦЦА БВА?

Беларуская вызвольная армія грунтуецца на гістарычных традыцыях фармаваньня народнай узброенай сілы з прафэсійных вайскоўцаў і добраахвотнікаў. Для абароны краіны на беларускіх землях разам з княскай дружынай, баярамі, пазьней — шляхтай традыцыйна зьбіралася народнае войска, у Вялікім Княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў — Паспалітае рушэньне. У вайсковую гісторыю беларусаў упісаныя традыцыі партызанскага і паўстанцкага руху, стварэньня атрадаў самаабароны, падпольля, дывэрсійных групаў, нацыянальных добраахвотніцкіх фармаваньняў. Аналіз гэтай спадчыны актыўна выкарыстоўваўся пры стварэньні БВА.

Дзяржаўны герб
Рэспублікі Беларусь



Дзяржаўны сьцяг
Рэспублікі Беларусь





Нагрудны знак
"За ўдзел у баявых дзеяньнях і абарону Ўкраіны"




Нагрудны знак прыналежнасьці да БВА




## З ЧАГО СКЛАДАЕЦЦА БВА?

Структуру Беларускай вызвольнай арміі распрацоўвае і зацьвярджае орган кіраваньня БВА ў асобным парадку, яна зьяўляецца сакрэтнаю. У агульным сэньсе службовая структура БВА складаецца з баявога актыву і рэзэрву БВА. Службоўцы БВА — удзельнікі баявых і парамілітарных фармаваньняў, партызанскіх і падпольных груп — зьяўляюцца баявым актывам БВА. Вайсковая структура БВА складаецца з баявых групаў, падразьдзяленьняў і частак, дысьлякаваных на тэрыторыі Ўкраіны, а таксама з “зонаў дзеяньняў” аўтаномных баявых падпольных ячэяк на тэрыторыі Беларусі. У баявы актыў уваходзіць вайсковы рэзэрв — службоўцы БВА, якія праходзяць вайсковае навучаньне альбо спэцыяльную падрыхтоўку. Службоўцы БВА — сябры палітычных і грамадзкіх арганізацый, у тым ліку падпольных арганізацый у Беларусі, называюцца рэзэрвам БВА. Цывільная структура БВА выбудоўваецца ў адпаведнасьці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам краінаў, на тэрыторыі якіх яна разьмяшчаецца, уключаючы тэрыторыю Беларусі.

## ЯК ЗАБЯСЬПЕЧВАЕЦЦА БВА?

БВА фінансуецца шляхам адкрытага, легальнага прыцягненьня сродкаў і збору сродкаў ад асабовага складу БВА. Таксама БВА арганізоўвае выпуск лічбавых бондаў (токенаў) з мэтаю забясьпечаньня вайсковага будаўніцтва і выкананьня баявых і палітычных задачаў.

## ЯК МОЖНА ПАДТРЫМАЦЬ БВА?

Беларускую вызвольную армію можна падтрымаць сваёй працай дзеля дасягненьня мэтаў БВА, інфармацыйнай, матэрыяльна-тэхнічнай, фінансавай ці іншай дапамогай. Для гэтага трэба зьвярнуцца з прапановай да службоўца Часовай вайсковай камісіі БВА або ўпаўнаважанага БВА ў вашым рэгіёне і, пасьля вэрыфікацыі вашай асобы, наладзіць плённае супрацоўніцтва.

## ХТО КІРУЕ БВА?

На этапе фармаваньня БВА органам кіраваньня ёю ёсьць Часовая вайсковая камісія (ЧВК) на чале са Старшынём ЧВК. ЧВК зьяўляецца калегіяльным прадстаўнічым органам вайсковага кіраваньня БВА і на пэўным этапе трасфармуецца ў Камандаваньне БВА. ЧВК спыняе сваю дзейнасьць з моманту перадачы паўнамоцтваў Камандаваньню БВА на чале з Камандуючым. ЧВК ствараецца прадстаўнікамі беларускіх вайсковых фармаваньняў і парамілітарных арганізацый. Чальцамі ЧВК могуць быць прадстаўнікі іншых арганізацый або фізычныя асобы, у тым ліку цывільныя, якія маюць досьвед працы ў розных галінах дзяржаўнага і вайсковага будаўніцтва і падзяляюць мэты і задачы Беларускай вызвольнай арміі.

## ХТО МОЖА БЫЦЬ СЛУЖБОЎЦАМ БВА?

Беларуская вызвольная армія ў сваёй дзейнасьці абапіраецца на шырокую падтрымку ўсяго беларускага грамадзтва як унутры краіны, так і па-за яе межамі, таму службоўцам БВА можа быць любы, хто падзяляе яе агульныя мэты і стратэгію.

## ЦІ МАЕ БВА ЗНАК ВАЙСКОВАГА ПРЫВІТАНЬНЯ?

Так, службоўцы БВА выкарыстоўваюць гістарычна абгрунтаваны асобны знак–жэст пашаны і вайсковага прывітаньня. Гэты знак уяўляе сабой прыцісканьне да сэрца рукі, сагнутай у локці, пры гэтым пальцы сціснуты ў кулак, быццам бы трымаючы меч. Гэты жэст мае асобную назву — “Малая Пагоня”, бо літаральна, хаця б і ўмоўна, паўтарае яе. Такі знак пашаны і прывітаньня выкарыстоўваецца асобным вайскоўцам стоячы ці ў руху, а ў іншых выпадках, напрыклад, у вайсковых рытуалах — у вайсковым шыхце. Рука на сэрцы наглядна і вельмі сымбалічна стасуецца з выявай “Малой Пагоні” на першай вайсковай узнагародзе Вольнай Беларусі — Мэдалі за баявыя заслугі Рады БНР. Пры асабістым разьвітаньні да жэсту дадаецца дэвіз “Жыве Беларусь!” і адказ “Жыве вечна!”.





ЭМБЛЕМЫ РОДАЎ ВОЙСКАЎ І СЛУЖБ БВА

## ЦІ БУДЗЕ БВА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ЗБРОЮ СУПРАЦЬ ЗЛАЧЫННАГА РЭЖЫМУ?

БВА зыходзіць з таго, што рэжым на чале з А. Лукашэнкам утрымлівае дзяржаўную ўладу ў Беларусі неканстытуцыйным шляхам праз учыненьне трывалага злачынства. Народ Беларусі мусіць вярнуць сабе гэтую ўладу ўсімі наяўнымі ў яго сродкамі, у тым ліку праз разбудову сваёй вайсковай структуры. Каб пазьбегнуць праліцьця крыві, БВА вітае пераход на свой бок прадстаўнікоў сілавых структур.

## ЦІ ДАЗВОЛЕНА СЛУЖБОЎЦАМ БВА РАБІЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ КАР’ЕРУ?

Так, бо БВА — грамадзка-палітычная арганізацыя. Нават Афіцэрскім кодэксам БВА прадугледжана, што службовец БВА выконвае свае грамадзянскія абавязкі, у тым ліку ўдзельнічае ў выбарах і грамадзянскіх ініцыятывах. Гэта значыць, што службоўцы БВА маюць права падчас службы быць адказнымі грамадзянамі, дапамагаць беларускаму дэмакратычнаму руху ўласным досьведам, маюць асабістыя палітычныя погляды, што, дарэчы, характэрна для фармаваньняў беларускіх добраахвотнікаў ва Ўкраіне. Забароненыя толькі дзеяньні, якія ставяць пад пагрозу выкананьне баявой задачы. Службовец БВА кіруецца выключна інтарэсамі Беларусі, таму своечасова робіць выбар паміж палітычнай і вайсковай кар’ерай.

## ЦІ ЁСЬЦЬ У БВА ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ?

Асноўныя арганізацыйныя захады па стварэньні Беларускай вызвольнай арміі былі зробленыя ў лістападзе 2023 году і фактычна супалі з Днём герояў — 27 лістапада. У гэты дзень прадстаўнікі беларускіх нацыянальных вайсковых фармаваньняў і парамілітарных арганізацый пацьвердзілі свой намер супрацоўнічаць у будаўніцтве БВА. Дакумэнтальна гэтае рашэньне было аформленае 30 лістапада 2023 году падпісаньнем Дэклярацыі аб стварэньні Часовай вайсковай камісіі БВА. Шануючы памяць беларусаў, якія загінулі ў барацьбе за незалежнасьць нашай Радзімы і ў знак пераемнасьці зь іх гераічнымі традыцыямі, мы сьвяткуем дзень стварэньня БВА ў Дзень герояў.

## ЦІ ЁСЬЦЬ У СКЛАДЗЕ БВА ГЕНЭРАЛЫ?

**Пакуль няма, але гэта пытаньне часу і арганізацыйных захадаў. У складзе БВА ёсць палкоўнікі — службоўцы, якія маюць вайсковую акадэмічную адукацыю альбо акадэмічную адукацыю МУС. Таксама вырашаюцца пытаньні адпаведнай вайсковай адукацыі ці падрыхтоўкі ў краінах блёку NATO, таму зьяўленьне сапраўдных генэралаў БВА абсалютна заканамернае.**



## ЦІ ЁСЬЦЬ У СКЛАДЗЕ БВА ЖАНЧЫНЫ?

**Прынцыпы адбору кандыдатаў у БВА не прадугледжваюць полавой, расавай, рэлігійнай ці іншай сэгрэгацыі. БВА патрэбныя перш за ўсё дасьведчаныя прафэсіяналы ў розных кірунках вайсковага будаўніцтва і ўзброенага супраціву, людзі адданыя барацьбе за свабоду Беларусі, якія маюць адпаведную рэпутацыю. Жанчыны ёсьць перадусім у нашай грамадзка-палітычнай арганізацыі, але і ў вайсковай арганізацыі БВА яны тасама ёсьць.**

## ЯКІЯ СТАСУНКІ Ў БВА ЗЬ ВЯДОМЫМІ ПАЛІТЫЧНЫМІ ЦЕНТРАМІ БЕЛАРУСКАГА ДЭМАКРАТЫЧНАГА РУХУ?

**Беларуская вызвольная армія зьяўляецца складнікам агульнага дэмакратычнага руху Беларусі, з павагай і разуменьнем ставіцца да ўсіх вядомых цэнтраў і асобных гульцоў на палітычнай мапе краіны і замежжа. Больш за тое, БВА імкнецца да плённага супрацоўніцтва, каардынацыі і ўзаемадапамогі паміж беларусамі, і вынікі такога падыходу ўжо бачныя. Напэўна, службоўцы БВА сярод тых, хто выключна добра разумее шкоднасьць спрэчак, ультыматумаў, абразаў у вайсковым лягеры ўноч перад штурмам варожых пазыцый.**



Пагоны да параднай і парадна-прадстаўнічай формы



Галоўны сяржант



Ротмістар



Падпалкоўнік



Герэрал арміі

## ЦІ МАЕ БВА ВАЙСКОВЫЯ РАНГІ?

Як і кожная вайсковая арганізацыя, Беларуская вызвольная армія мае вайсковыя рангі. Яны адпавядаюць гістарычным традыцыям беларускага войска як паводле назваў, так і паводле сымбаляў для іх абазначэньня. У БВА выкарыстоўваюцца наступныя рангі: рэкрут, жаўнер, капрал, старшы капрал, сяржант, старшы сяржант, галоўны сяржант, падхаружы, харужы, старшы харужы, падпаручнік, паручнік, ротмістар, маёр, падпалкоўнік, палкоўнік, генэрал брыгады, генэрал–маёр, генэрал–паручнік, генэрал–палкоўнік, генэрал арміі. Усе гэтыя рангі адпавядаюць кодам NATO. Сыстэма знакаў адрозьненьня па вайсковых рангах заснаваная на выкарыстаньні пагонаў з галуннымі нашыўкамі для унтэр-афіцэрскага складу, васьміканцовымі зорачкамі для афіцэраў, а таксама з гербам “Пагоня” ўзору 1991 году і лісьцем дуба для генэралаў.

## ЦІ ПРАЦУЕ БВА З МОЛАДЗЬДЗЮ?

Так, працуе. Пры падтрымцы Беларускай вызвольнай арміі, згодна з традыцыямі скаўцкага руху, ствараецца Беларускі саюз адважных — БСА, які ставіць на мэце выхаваньне моладзі на беларускіх нацыянальных традыцыях, вывучэньні гісторыі і культуры Беларусі, інтэлеклектуальнае і фізычнае разьвіцьцё дзяцей і падлеткаў згодна зь іх інтарэсамі і здольнасьцямі. Падчас вайсковых дзеяньняў з моладзі БСА фармуюцца Шэрыя харугвы — дапаможная служба БВА, якая ў залежнасьці ад узросту дапамагае Беларускаму войску, а адважныя прызыўнога ўзросту змагаюцца ў складзе адзінак БСА ці ў складзе БВА.



Эмблема і бярэт БСА

## ЯКІЯ ЎЗНАГАРОДЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЕ БВА?

**Распрацаваны праект новай нацыянальнай сыстэмы ўзнагародаў, які складаецца з трох узроўняў ці ступеняў: ніжэйшы — мэдалі (іх — 11), сярэдні — крыжы (шэсьць) і вышэйшы — ордэны (іх таксама шэсьць). Паводле прызначэньня, яны дзеляцца на вайсковыя і цывільныя. Актуальныя беларускія вайсковыя ўзнагароды ўключаюць узнагароды Беларускай Народнай Рэспублікі, якія ўручае Рада БНР, а таксама іншыя ўзнагароды паводле распрацаванага праекту новай сыстэмы нацыянальных узнагародаў Беларусі. Вайсковыя ўзнагароды БНР уключаюць Мэдаль за баявыя заслугі і Ордэн Жалезнага рыцара, а таксама Мэдаль Партызана. Акрамя іх, праект сыстэмы ўзнагародаў прадугледжвае Мэдаль за дапамогу Беларускаму войску, Мэдаль за адвагу (праяўленую ў мірны ці ваенны час). Баявыя крыжы, прадугледжаныя праектам сыстэмы ўзнагародаў: Крыж змаганьня Тадэвуша Касьцюшкі, Крыж ахвярнасьці Эміліі Плятэр, Партызанскі народны Крыж. Вайсковыя ордэны, прадугледжаныя праектам: Ордэн Усяслава Чарадзея, Ордэн Кастуся Каліноўскага, Ордэн герояў (як за вайсковыя, так і за цывільныя заслугі).**





Крыж Ордэна Жалезнага рыцара Рады БНР




Мэдаль Партызана Рады БНР

**УЗНАГАРОДЫ БВА:**



Крыж Змаганьня Тадэвуша Касьцюшкі



Партызанскі Народны крыж



Крыж Ахвярнасьці Эміліі Плятэр



Мэдаль "За адвагу"



Мэдаль "За дапамогу Беларускаму войску"

Баявы сьцяг БВА




# ЯКУЮ СЫМБОЛІКУ ВЫКАРЫСТОЎВАЕ БВА?

БВА мае ўласную сымболіку, перш за ўсё эмблему, якая разьмешчаная на Баявым сьцягу, форме адзеньня, узнагародах, значках, баявой тэхніцы і іншай прадукцыі, а таксама на мэдыярэсурсах БВА. Эмблема Беларускай вызвольнай арміі ўяўляе сабой васьмі-канцовую гранёную зорку (Беларускую вайсковую зорку) серабрыстага колеру, у цэнтры якой разьмешчаны круглая тарча кармазынавага (цёмна–чырвонага) колеру з аблямоўкай і заклёпваньнямі серабрыстага колеру. Васьміканцавая зорка ўзятая з аўтэнтычных пячатак полацкіх князёў XII стагодзьдзя. Такая зорка пазначае паняцьці “Бог”, “Сонца”, “Добрая вестка”, “Пачатак”, “Нараджэньне” і іншыя. У цэнтры тарчы разьмешчаны шасьціканцовы крыж Усяслава Полацкага — Сьвяты Крыж, які выкарыстоўваўся ў якасьці галоўнага сымбаля полацкай княскай дынастыяй Рагвалодавічаў. Дазваляецца пры неабходнасьці пад эмблемай разьмяшчаць надпіс: “Беларуская вызвольная армія” або “Biełaruskaja vyzvolnaja armija”. Кармазынавы колер на эмблеме ўзяты з вайсковых сьцягоў часоў антырасейскіх паўстаньняў XVIII–XIX стагодзьдзяў.

# ЯКОЕ ДАЧЫНЕНЬНЕ МАЕ ДА БВА ВЫЯВА ВАЎКА?

Акрамя агульнай сымболікі БВА — зоркі з крыжом, спатрэбілася зразумелая вобразная выява службоўца БВА, які гераічна змагаецца ва Ўкраіне. Гэтым асацыятыўным вобразам быў абраны воўк ці ваўкалак з крыжом, паколькі, паводле легенды, князь Усяслаў Чарадзей ператвараўся ў ваўка і ўначы нечакана зьяўляўся перад ворагам. З гэтай жа нагоды да нашай уніформы былі ўзяты шэры “воўчы” колер тканіны. Эмблема ваўка зьяўляецца дадатковай і разьмяшчаецца на ўніформе службоўцаў БВА, якія ваююць ва Ўкраіне.

# ЦІ ЁСЦЬ У БВА ДЭВІЗ-ПОКЛІЧ?

Так, дэвізы гэта — распаўсюджаныя зьявы ў палітычным жыцьці і у вайсковай службе. Покліч Беларускай вызвольнай арміі — “Час вяртаць Беларусь!”.






Нарукаўны знак да паўсядзёнай і баявой формы і знак на галаўны ўбор з выявай ваўка.

## ЯКІМ ЧЫНАМ МОЖНА ЎСТУПІЦЬ У БВА?

**Фактычна службоўцам Беларускай вызвольнай арміі можа стаць кожны, хто падзяляе прынцыпы Дэклярацыі аб стварэньні Часовай вайсковай камісіі БВА, напіша заяву пра далучэньне да БВА, пройдзе праверку па наяўных у распараджэньні структур БВА базах дадзеных. Глыбіню праверак вызначае непасрэдны камандзір. Кандыдат у склад БВА праходзіць сумоўе з упаўнаважаным БВА або зь непасрэдным камандзірам. Пры залічэньні службоўца БВА ў склад ЧВК дадаткова праводзіцца пашыраная праверка з абавязковым выкарыстаньнем OSINT-аналізу кандыдатуры, праверкай на паліграфе, гарантыямі ня меней як двух службоўцаў. Кандыдат залічваецца ў склад ЧВК БВА пасьля пэрыяду праверкі, які вызначаецца ў два месяцы. Усе прадстаўнікі асабовага складу — службоўцы БВА — прымаюць Прысягу на адданасьць народу Беларусі, атрымліваюць Службовае пасьведчаньне БВА і дзейнічаюць адпаведна ўнутраным дакумэнтам БВА, а таксама загадам і распараджэньням органу кіраваньня БВА.**



Вышэйшая нацыянальная ўзнагарода Беларусі — Ордэн Герояў



Кукарда БВА

## ПРЫСЯГА БЕЛАРУСКАЙ ВЫЗВОЛЬНАЙ АРМІІ

**Я, уступаючы ў Беларускую вызвольную армію, станаўлюся ў адзін шэраг са сваімі гераічнымі продкамі, якія спрадвеку баранілі Беларусь ад варожай навалы.**
**Я абяцаю, што аддам усе сілы для перамогі над ворагам, буду варты памяці продкаў і сучасных герояў, якія аддалі жыцьцё, каб жыла Бацькаўшчына.**
**Як службовец Беларускай вызвольнай арміі, я ведаю, што сіла ня ў колькасьці, а ў гарце духу і волі, у гонары беларускага жаўнера.**
**Я абяцаю, што ня выпушчу зброі з рук, пакуль не ўсталюю свабоду, законнасьць і правапарадак на Беларускай зямлі.**
**Я абяцаю выконваць гэтую прысягу добрахвотна і неаспрэчна, абяцаю сумленна выконваць усе загады камандзіраў.**
**Калі я парушу гэтую прысягу, няхай мяне пакарае суворы закон вайны і спасьцігне пагарда Беларускага народу.**
**Жыве Беларусь! Жыве вечна!**




Службовае пасьведчаньне чальца БВА



Зацьверджаныя эскізы парадна і парадна-прадстаўнічай формы

Нацыянальная стужка да верхняга гузіка мундура

Форменная пятліца

## ЦІ ЁСЬЦЬ У БВА СВАЯ ВАЙСКОВАЯ ФОРМА?

Беларуская вызвольная армія мае сваю форму з колерамі і эмблемамі родаў войскаў і службаў, нарукаўнымі знакамі прыналежнасьці да БВА. Гэта парадна–выхадная форма, парадна–прадстаўнічая форма, паўсядзённая форма і баявая форма. Першыя дзьве формы шэрага колеру маюць ў камплекце шэры або кармазынавы бэрэт з кукардай, паліто зімовае, кіцель (для жанчынаў — жакет) парадны, мундур парадны, штаны з кантам кармазынавага колеру (у генэралаў кант абшываецца серабрыстым галуном, утвараючы лямпас), спадніцу (або штаны) для жанчын, кашулю белага колеру, гальштук чорнага колеру, туфлі скураныя чорнага колеру, боты ўцепленыя чорнага колеру, боты з высокімі халявамі чорнага колеру. Камплект да паўсядзёнай і баявой формы адзеньня ахоўнага колеру ўключае: шэры бэрэт, альбо кепі, панаму з кукардай, куртку ўцепленую, кіцель–куртку, або тактычную кашулю, штаны, джэмпэр флісавы, майку–пола, майку–футболку, боты ўцепленыя ахоўнага колеру, боты зь нізкімі або высокімі халяамі ахоўнага колеру. Зразумела, што пакуль большасць службоўцаў БВА ва Ўкраіне выкарыстоўвае баявую форму ЗСУ.

## ШТО АСАБЛІВАГА Ў КАРМАЗЫНАВЫМ БЭРЭЦЕ?

У Беларускай вызвольнай арміі носяць агульнавайсковы бэрэт шэрага колеру пры парадна-прадстаўнічай форме шэрага колеру, каляровы бэрэт роду войскаў — пры парадна-выходнай форме шэрага колеру і паўсядзённай форме ахоўнага колеру. У адрозьненьне ад пералічаных галаўных убораў, якія, па сутнасьці, зьяўляюцца знакам прыналежнасьці да акрэсьленых падразьдзяленьняў — кармазынавы бэрэт мае статус знака адрозненьня, гэта значыць, асаблівага статуснага бэрэта для вайскоўцаў БВА, якія ваююць ва Ўкраіне і маюць баявыя ўзнагароды. Гэты бэрэт дазваляецца насіць пры любой форме.

## ЦІ ЁСЬЦЬ ВЫНІКІ АД ДЗЕЙНАСЬЦІ БВА ЎЖО ЦЯПЕР?

Беларуская вызвольная армія — праект сучаснасьці і будучыні. Аднак, нягледзячы на сваю невялікую гісторыю, БВА ўжо атрымала буйную перамогу над разьяднанасьцю, адсутнасьцю дыялёгу і супрацоўніцтва паміж беларускімі добраахвотніцкімі фармаваньнямі, вайсковымі і параміліатрнымі структурамі беларускага дэмакратычнага руху. У складзе БВА яны працуюць кансалідавана, але аўтаномна, таму любая вялікая і малая пасьпяховая акцыя ўпісваецца залатымі літарамі ў гісторыю збройнага супраціву беларусаў, у гісторыю БВА, умацоўвае падмурак нашай будучай Вялікай Перамогі.

## ЯКІЯ ПЛЯНЫ МАЕ БВА ПАСЬЛЯ ПЕРАМОГІ?

Пасьля аднаўленьня канстытуцыйнага ладу і законнасьці ў Беларусі БВА будзе ўдзельнічаць у фармаваньні органаў дзяржаўнай улады, стане асновай для стварэньня Беларускага войска і сілаў аховы правапарадку. Удзельнікам Беларускай вызвольнай арміі дзяржава гарантуе пашану і павагу, поўную кампэнсацыю стратаў, выкліканых дзеяньнямі незаконнага рэжыму, і сацыяльныя льготы.



## ЧЫМ АСАБЛІВЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЦА СЛУЖБОЎЦЫ БВА?

Службоўцы Беларускай вызвольнай арміі зьнешне звычайныя людзі, але яны маюць сталёвы стрыжань у выглядзе нормаў паводзінаў. Сам па сабе ўступ у БВА зьяўляецца сьмелым учынкам, бо вядзе да пэўных пагрозаў. Надалей служба ў БВА вымагае дэманстрацыі ў кожным дзеяньні гонару і адвагі, вайсковага братэрства, высокага прафэсіяналізму, адпаведнасьці праўным нормам і патрабаваньням дысцыпліны. Службоўцы БВА служаць менавіта беларускаму народу, беларускаму грамадзтву, а не палітычнаму кіраўніцтву і гатовыя ахвяраваць сваім жыцьцём і здароўем дзеля паляпшэньня жыцьця беларускага народу.




Кінжал, круглая кукарда, аксэльбант і пасавая спражка БВА

Геральдычная рада Пагоня










Кукарда, жэтон,
агульны нарукаўны знак прыналежнасьці
да беларускіх фармаваньняў,
нарукаўны знак БВА,
адзнакі вайсковых рангаў старшага харужага,
паручніка, палкоўніка, генэрала брыгады БВА.